# Раскажы, дзядуля, як быў паранены

**_Увесь жыццёвы шлях Уладзіміра Петухова прайшоў у адным населенным пункце – вёсцы Зарэчча Трасцінскага сельвыканкама. Канешне, не лічачы час ваеннага ліхалецця, што прынудзіў пакінуць родныя мясціны._**



Увесь жыццёвы шлях Уладзіміра Петухова прайшоў у адным населенным пункце – вёсцы Зарэчча Трасцінскага сельвыканкама. Канешне, не лічачы час ваеннага ліхалецця, што прынудзіў пакінуць родныя мясціны.

У 1943 годзе, пасля асвабаджэння Хоцімскага раёна, быў прызваны на ваенную службу. Накіраваліся ў г. Клімавічы.

– Праз нейкі час нас выстраілі і з ўсёй колькасці юнакоў адабралі 100 чалавек, астатніх адпусцілі дамоў, – успамінае Уладзімір Якаўлевіч. – У ліку гэтай сотні быў і я. Размясціліся мы ў дзесяці кіламетрах ад Чэрыкава ў лесе, дзе знаходзіўся штаб. Я трапіў у 191 роту сувязістаў.

Некалькі дзён было адведзена на авалоданне сувязной справай. Вучылі як працягваць лініі сувязі, як падключаць і г.д. Затым маладыя салдаты ўжо самастойна трымалі сувязь. Увесь час перамяшчаліся з адной мясцовасці ў другую. Спачатку знаходзіліся каля вёскі Лясная, затым у Анікавічах, на станцыі Тошчыца, у Слаўгарадзе, Крычаве. У чэрвені 1944 года частка хутка была накіравана пад г. Чавусы.

– Ноччу ў лясным масіве пад Чавусамі, выконваючы заданне, на мінах падарвалася 7 чалавек, сапёраў жа з намі не было, – цяжка уздыхае Уладзімір Петухоў. – Тут мы спыніліся, раненых накіравалі ў санбат. Раніцай пачалі аглядацца навокал, перабраліся цераз рэчку. А я ж хлопец бойкі, хуткі, камандзіра з намі не было, паспяшыў, вось і патрапіў на міну... За сваю прыткасць застаўся без нагі. Павандраваў з аднаго медсанбата ў другі, на гэтым і скончылася ваенная дзейнасць.

Дамоў прыбыў у канцы 1944 года, сустрэла маці, блага родная хата ўцалела. У 1945 бацька прыйшоў з вайны, таксама паранены.

Працаваць Уладзімір Якаўлевіч пайшоў у калгас "Трасціно" кладаўшчыком. Думаю, нікому не трэба паясняць, што прадстаўляла з сябе пасляваенная гаспадарка. Пра якія-та зарплаты тут рэчы не вялося.

У 1951 годзе, калі аб'ядналі 2 калгасы, У. Петухоў пачаў працаваць бухгалтарам, прайшоў для гэтага спецыяльныя курсы. З 1971 г. і да 1984 г. (якраз да выхаду на заслужаны адпачынак) працаваў запраўшчыкам.

Разам з супругай пяцёра дзетак паднялі на ногі. Як птушкі да роднага гнязда, яны заўсёды спяшаюцца праведаць бацьку, паклапаціцца аб яго здароўі. Багацце пажылога чалавека ў тым, што мае 11 унукаў і 9 праўнукаў – прадаўжэнне роду!

Каб не засмучацца, Уладзімір Якаўлевіч займаецца чытаннем кніг, якія, так сказаць, "з дастаўкай на дом" атрымлівае з Трасцінскай сельскай бібліятэкі.

– Чытаю, канешне ж, ваенную літаратуру, мастацкую, добра што зрок яшчэ дазваляе...

**Алена КАПАЕВА.**

**На здымку:** У. Петухоў.

**Фота аўтара.**



**Капаева, А. Раскажы, дзядуля, як быў паранены** : [пра Уладзіміра Петухова, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны] / Алена Капаева // Шлях Кастрычніка.— 2010.— 25 верасня.— С. 3.